7. *Положение* о рейтинговой системе оценки учебной деятельности на факультете БГПУ // Повышение качества профессиональной подготовки студентов: Метод. рек. – Мн.: БГПУ, 2002. – С.13–33.

8. *Вачков И.* Основы технологии группового тренинга. Психотехники: Учеб. пособие. – 2-е изд., перераб. и доп. – М.: «Ось89», 2000. – С.108.

9. *Профессиональная* кухня тренера (из опыта неформального образования в третьем секторе) / Отв. ред. Е.Карпиевич, В.Величко. – СПб.: Невский простор, 2003. – 135 с.

*Н.А.Агафонава*

## РЭЙТЫНГАВАЯ СІСТЭМА АЦЭНКІ ВЕДАЎ СТУДЭНТАЎ ПА КУРСУ "СУСВЕТНАЕ І БЕЛАРУСКАЕ КІНАМАСТАЦТВА"

Рэйтынгавая сістэма ацэнкі ведаў студэнтаў па курсу "Сусветнае і беларускае кінамастацтва" была ўведзена ў 1996 г. Назапашаны за гэты час метадычны вопыт выкарыстання сістэмы пацвярджае высокую эфектыўнасць абранага падыходу.

Па-першае, ён цалкам перакладае адказнасць за атрыманую ацэнку на студэнта.

Па-другое, мінімізуе ўздзеянне суб'ектыўнага фактара (у асобе выкладчыка) на вынік вучэбнай дзейнасці студэнта і дазваляе захоўваць "празрыстасць" працэсу акумуляцыі крэдытаў (балаў, працэнтаў, адзінак і інш.).

Па-трэцяе, стымулюе вучэбную, навуковую, творчую актыўнасць студэнта на працягу ўсяго семестра, а не толькі падчас заліковай ці экзаменацыйнай сесіі.

Па-чацвёртае, здымае значны цяжар псіхалагічнага стрэсу навучэнца непасрэдна ў момант здачы экзамену за кошт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

максімальнай прадказальнасці выніку, нейтралізуючы значнасць “шчаслівага выпадку” на іспытах.

Рэйтынгавая сістэма грунтуецца на прынцыпе акумуляцыі (назапашвання) крэдытаў. Задача выкладчыка – прапанаваць студэнту максімальны спектр магчымасцей для напрацоўвання крэдытаў і адпаведную табліцу вызначэння ацэнкі. Напрыклад, пры выкарыстанні трохбальнай сістэмы (здавальняюча, добра, выдатна) падобная табліца выглядае наступным чынам (табл.1.).

*Табліца 1*

| **Ацэнка** | **Крэдыты** |
|---|---|
| Выдатна | Ад 76 да 100 |
| Добра | Ад 61 да 75 |
| Здавальняюча | Ад 46 да 60 |

Калі табліцу трансфармаваць згодна з дзесяцібальнай сістэмай, то вызначэнне ацэнкі будзе наступным.

*Табліца 2*

| Ацэнка | Крэдыты |
|---|---|
| 10 | Ад 90 да 100 |
| 9 | Ад 80 да 90 |
| 8 | Ад 70 да 80 |
| 7 | Ад 60 да 70 |
| 6 | Ад 50 да 60 |
| 5 | Ад 40 да 50 |
| 4 | Ад 30 да 40 |
| 3 | Ад 20 да 30 |
| 2 | Ад 10 да 20 |
| 1 | Ад 0 да 10 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Умовы рэйтынгавага падыходу пры ацэнцы ведаў студэнтаў спецыялізацый “выкладчык сусветнай мастацкай культуры” і “кампаратыўнае мастацтвазнаўства” па курсах, звязаных з кінамастацтвам, агалошваюцца на першых занятках па прадмету і занатоўваюцца навучэнцамі на тытульнай старонцы канспекта.

Па курсу “Сусветнае і беларускае кінамастацтва” для азначаных спецыяльнасцей змадэлявана асобная шкала крэдытаў, у якой згодна з інтэгратыўным падыходам адлюстраваны ўзаемасувязь трох дысцыплін (“Гісторыя сусветнага і беларускага кінамастацтва”, “Аналіз помнікаў мастацтва”, раздзел кіно, “Прагляд помнікаў мастацтва”, раздзел кіно) і адпаведнасць паміж відам вучэбнай дзейнасці студэнтаў і колькасным паказчыкам з улікам якаснага параметра (табл.3).

*Табліца 3*

| Віды дзейнасці студэнтаў | Колькасць крэдытаў (min) | | (max) |
|---|---|---|---|
| 1. Наведванне заняткаў | 1 | | 5 |
| 2. Актыўнасць на занятках (дыскуціраванне на лекцыях, выступленне на семінарах і практычных) | 1 | 4 | 6 |
| 3. Вядзенне сшыткаў па аналізе фільма | 1 | | 5 |
| 4. Аналіз кінатвораў у фармаце 1:1 | 1 | | 6 |
| 5. Вядзенне кінадзённікаў | 1 | | 10 |
| 6. Выступленне на навуковых канферэнцыях | | 10 | |
| 7. Публікацыі | 1 | | 10 |
| 8. Тэст па тэорыі кінамастацтва | 1 | | 9 |
| 9. Тэст кіназнаўчы | 1 | | 16 |
| 10. Іспыты | 1 | | 12 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першы пункт – наведванне заняткаў – адлюстроўвае ўлік прапушчаных студэнтам аўдыторных заняткаў. Пры гэтым фактар "адсутнасці па ўважлівай прычыне" нейтралізаваны (не існуе), бо падлік адпаведных крэдытаў вядзецца згодна з прынцыпам прапарцыянальнасці. Напрыклад, калі агульная колькасць заняткаў (не гадзін) складае 40, то дапушчальная колькасць пропускаў па адным крэдыце складае 8 (40: 5=8). Адпаведна, калі студэнт прапусціў ад 1 да 8 заняткаў, ён атрымлівае 5 (max) крэдытаў, калі пропускі склалі ад 9 да 16, то сума крэдытаў складае 4, калі прапушчана ад 17 да 24, – 3, ад 25 да 32 – 2 крэдыты, ад 33 да 39 – 1 крэдыт, 40 прапушчаных заняткаў – 0 крэдытаў.

Другі пункт – актыўнасць на занятках – прадугледжвае разгалінаванне як па колькасным крытэрыі, так і па якасным. Актыўнасць студэнта падчас лекцыі вымяраецца яго пытаннямі, удакладненнямі, меркаваннямі па адным з аспектаў тэмы, што дэманструе пэўны ўзровень яго падрыхтаванасці і можа дадаць яму 1 крэдыт. Актыўнасць на семінарскіх і практычных занятках (апаніраванне, каменціраванне, дапаўненні і інш.) адлюстроўвае крэатыўныя здольнасці студэнта, яго зацікаўленае стаўленне да дыскуціруемай праблемы і ўменне выказаць і абгрунтаваць сваю думку. Гэта дадае навучэнцу ад 1 да 2 крэдытаў. Выступленне на семінарах прадугледжвае ад 4 да 6 крэдытаў. Пры гэтым улічваюцца аналітычны падыход да выкладаемай праблемы на падставе вывучэння асноўных крыніц вучэбна-дапаможнай літаратуры (да 4-х крэдытаў), самастойна падабраны ілюстрацыйны матэрыял і абавязкова кола выкарыстанай дадатковай навуковай літаратуры (да 6 крэдытаў).

Трэці пункт – вядзенне сшыткаў па аналізе фільма – вымяраецца 1–5 крэдытамі. У сшытках занатоўваецца мастацтвазнаўчы аналіз кінатвора, які здзяйсняецца калектыўна на адпаведных практычных занятках. Сшыткі –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэта канкрэтны вынік аўдыторнай працы, а таксама асабістай творчасці канкрэтнага студэнта і, што немалаважна, яго дысцыплінаванасці і акуратнасці.

Чацвёрты пункт – аналіз кінатвораў у фармаце 1:1 – прадугледжвае актывізацыю самастойнай індывідуальнай работы студэнта, дзе ён здольны набраць ад 1 да 6 крэдытаў. Кінатворы для індывідуальнага мастацтвазнаўчага аналізу прапануюцца згодна з вучэбнай праграмай і канкрэтнай методыкай, а таксама выключна ў канкрэтны тэрмін. Аналіз выконваецца студэнтам пісьмова і агалошваецца на семінарскіх занятках па адпаведнай тэме. Такім чынам лёгка пераадольваецца “сіндром нагрувашчвання” ў канцы семестра, калі студэнты звычайна рыхтуюць і здаюць на праверку пераважную колькасць работ.

Пяты пункт шкалы крэдытаў – вядзенне кінадзённікаў – цалкам адрасаваны ў сферу самастойнай работы студэнта і прадугледжвае ад 1 да 10 крэдытаў. У кінадзённіку занатоўваюцца эмацыянальныя ўражанні і разважанні аб паэтыцы кінастужак, якія студэнт глядзіць па-за межамі вучэбнай праграмы і вучэбнай аўдыторыі, кіруючыся ўласным выбарам. Дзённікі здаюцца на чытанне выкладчыку не пазней, чым за месяц да завяршэння семестра.

Пункт шосты – выступленне на навуковых канферэнцыях – дае студэнту вялікі дадатак у 10 крэдытаў і стымулюе яго даследчую дзейнасць. Пры гэтым ёсць рэальны шанц пераадольвання навучэнцам ўнутрыуніверсітэцкай мяжы і заахвочвання яго да ўдзелу ў навуковых канферэнцыях у іншых установах.

Сёмы пункт шкалы крэдытаў – публікацыі – таксама прэзентуе шырокі спектр крэдытавання, ад 1 да 10. Тут улічваюцца жанр публікацыі (анатацыя, тэзісы, рэцэнзія, артыкул) і выданне (унутрыуніверсітэцкае, гарадское, рэспубліканскае; дэпанаванае, друкаванае, інтэрнетнае). Напрыклад, калі гэта анатацыя на фільм у інтэрнэтным



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выданні, то такая публікацыя прыносіць студэнту 1–2 крэдыты. Калі гэта дэпанаваныя тэзісы, 4–6 крэдытаў. Калі рэцэнзія ў газеце ці часопісе, то 6–10 крэдытаў, калі артыкул – 9–10.

Асаблівае месца ў шкале крэдытаў займае тэсціраванне. Яно праводзіцца ў канцы кожнага семестра. Першы тэст "Асновы тэорыі кінамастацтва" прадугледжвае атрыманне студэнтам ад 1 да 9 крэдытаў у залежнасці ад правільнасці адказаў. Тэст уключае дзевяць блокаў:

1. Кіно ў сістэме традыцыйных мастацтваў.
2. Кіно ў сістэме тэхнагенных мастацтваў.
3. Мастацкі час і прастора ў кіно.
4. Кадр.
5. Рух.
6. Мантаж.
7. Гукавы вобраз.
8. Відавая і жанравая класіфікацыя ў кіно.
9. Вызначэнне, што ёсць фільм як твор кінамастацтва.

У тэст уключаны заданні рознай ступені складанасці, якія прадугледжваюць канкрэтнасць ведаў студэнта, а таксама здольнасць да абагульненняў (напрыклад, даць уласнае азначэнне фільму як твору кінамастацтва). Акрамя таго, у тэст уведзены адна–дзве наўмысныя памылкі, якія студэнт здольны ці няздольны заўважыць і выправіць.

Другі тэст – кіназнаўчы – дае найбольш адэкватнае ўяўленне аб мастацтвазнаўчай падрыхтоўцы студэнта па курсу "Гісторыя сусветнага і беларускага кінамастацтва". Тэст грунтуецца на прынцыпе ідэнтыфікацыі шаснаццаці кінаэпізодаў, якія паслядоўна прапануюцца на экране. Мэта гэтага тэста – выяўленне ведання і адчування студэнтам пэўных стылевызначальных элементаў ці то канкрэтнага мастацкага напрамку ў кіно, ці кінашколы, ці рэжысёрскай манеры. Для тэсціравання навучэнец атрымлівае спецыяльную табліцу, дзе па гарызанталі адзначаны 16 (па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

колькасці эпізодаў) слупкоў, а злева па вертыкалі – 30 радкоў з прозвішчамі кінарэжысёраў у алфавітным парадку. Кожны правільна суаднесены з прозвішчам рэжысёра кінаэпізод дае адзін крэдыт. Унутраная структура тэста складаецца з трох ступеняў складанасці. Прыблізна 1/3 прапанаваных фрагментаў разлічана на распазнанне з першага кадра, бо запазычана з фільмаў, якія дэманстраваліся цалкам на занятках па "Прагляду помнікаў мастацтва" і аналізаваліся на практычных. Яшчэ каля 1/3 фрагментаў узяты з фільмаў, аб якіх узгадвалася на лекцыях і семінарах і нават, магчыма, даваўся ілюстрацыйны матэрыял. Але ў тэст уключаны іншыя эпізоды. І, нарэшце, 1/3 фрагментаў – гэта эксклюзіўны матэрыял з прыватных відэатэк. Разлік тут на тое, што студэнт не мог бачыць кінакарціны, з кантэксту якой яму прапануецца эпізод, што падбіраецца строга ў адпаведнасці са стылявымі асаблівасцямі аўтарскага (рэжысёрскага) почырку ці пэўнай мастацкай плыні. У гэтым кіназнаўчым тэсце таксама ёсць ускладняльныя дэталі, напрыклад прапушчаны асобныя прозвішчы кінарэжысёраў. Студэнт павінен дапісаць іх у свабодныя радкі, калі такая неабходнасць з'явіцца (пры дэманстрацыі пэўнага фрагмента). Не выключана таксама наяўнасць 2–3-х эпізодаў з фільмаў аднаго і таго ж рэжысёра.

Трэці тэст – таксама кіназнаўчы і выніковы. Ён прапануецца студэнтам у канцы вывучэння курсаў, звязаных з кінамастацтвам, і дадае да агульнай сумы ад 1 да 16 крэдытаў. У дадзеным выпадку студэнтам зноў прапануюцца 16 фрагментаў з фільмаў розных часоў і майстроў. Па меры дэманстрацыі эпізодаў навучэнцы запаўняюць асобныя карткі, на якіх указваюць кінашколу, мастацкі кірунак, прозвішча кінарэжысёра і назву кінастужкі. Кожная правільна запоўненая картка "каштуе" 1 крэдыт.

Апошні пункт у шкале крэдытаў – экзамен, які праводзіцца ў пісьмовай форме. Студэнты пішуць адказы на два пытанні згодна з атрыманым экзаменацыйным білетам на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працягу 1 гадзіны і 40 хвілін і здаюць свае лісткі на праверку. У залежнасці ад якасці адказу (паўната раскрыцця пытання, логіка ізлажэння, азначэнне галоўнага і асаблівага, структураванасць адказу і г.д.) студэнт здольны атрымаць ад 1 да 12 крэдытаў. Пісьмовае правядзенне экзамену дазваляе студэнтам выпрацоўваць навык лаканічнага і паўнавартаснага выказвання па азначанай праблеме самастойна, без кіруючай функцыі выкладчыка. Падобны вопыт вельмі эфектыўна рэалізуецца падчас правядзення так званых "зрэзаў ведаў" у працэсе акрэдытацыі універсітэта. Акрамя таго, пры пісьмовай форме правядзення экзамену значна ўскладняецца для навучэнца магчымасць спісвання, бо выкладчык у такіх умовах здольны здзяйсняць больш жорсткі кантроль. Нарэшце, пісьмовы адказ студэнта – гэта канкрэтны дакумент.

Згодна з набранай агульнай сумай крэдытаў па выніках семестра выводзіцца пэўная ацэнка (гл. табл. 1–3). Пры гэтым практыка выкарыстання рэйтынгавай сістэмы па курсу "Сусветнае і беларускае кінамастацтва" прадугледжвае шэраг стымулюючых прынцыпаў. Напрыклад, калі студэнт на працягу семестра набраў больш за 76 крэдытаў (па трохбальнай сістэме) і больш за 90 (па дзесяцібальнай сістэме), то ён вызваляецца ад іспытаў і атрымлівае высокую ацэнку. Калі сітуацыя адваротная і студэнт, акумулюючы ўсе параметры (у тым ліку іспыты), не дабраў мінімуму (46 крэдытаў па трохбальнай сістэме), ён атрымлівае самую нізкую ацэнку і пачынае новы семестр з мінуса. Гэта значыць, калі ён назапасіў, напрыклад, толькі 40 крэдытаў, то кропкай адліку для яго ў новым семестры будзе –6 , а не 0 крэдытаў, як у астатніх.

Яшчэ адным важкім стымулючым дысцыплінаванасць студэнта момантам рэйтынгавай сістэмы з'яўляецца штрафная санкцыя, што выкарыстоўваецца дзеля падтрымкі жорсткага графіка выканання і здачы навучэнцамі пэўных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

работ. У выпадку з дысцыплінай "Сусветнае і беларускае кінамастацтва" – гэта прадстаўленне для чытання сшыткаў па аналізе фільма і кінадзённікаў у канкрэтна вызначаны тэрмін. Кожны дзень спазнення (нягледзячы на якасць матэрыялаў) "мінусуе" 1 крэдыт ад агульнай сумы. Калі студэнт не з'яўляецца на тэсціраванне, якое праводзіцца раз у семестр у канкрэтны дзень, ён атрымлівае 0 крэдытаў, як, дарэчы, і ў іншым любым выпадку ігнаравання аднаго з дзесяці модуляў шкалы крэдытаў.

Неабходна падкрэсліць, што студэнт пры даволі жорстка акрэсленых умовах рэйтынгавай сістэмы мае права выбару. Ён не абавязаны выкарыстоўваць усе прапанаваныя блокі шкалы крэдытаў і можа мадэляваць з іх уласныя прапорцыі. Напрыклад, сканцэнтраваць намаганні выключна на тых пазіцыях шкалы крэдытаў, якія прыносяць найбольш буйныя сумы (тэсціраванне, публікацыі і інш.). А можа, наадварот, выбраць тактыку акумуляцыі шматлікіх "дробных" модуляў (наведванне заняткаў, вядзенне сшыткаў па аналізе фільма, актыўнасць на лекцыях, семінарскіх, практычных і г. д.). Пры гэтым практыка паказвае, што ў пераважнай большасці (звыш 90%) студэнты імкнуцца выкарыстаць усе магчымасці, якія ўказваюцца ў шкале крэдытаў. Так ці інакш менавіта сума набраных студэнтам крэдытаў вызначае адпаведную ацэнку па прадмеце.

Такім чынам, рэйтынгавая сістэма ацэньвання ведаў студэнтаў па курсу "Сусветнае і беларускае кінамастацтва" на працягу амаль дзесяці гадоў дае плённыя вынікі. Студэнты адчуваюць асабістую адказнасць за выніковую ацэнку па прадмеце і вымушаны працаваць сістэматычна і эфектыўна, як і належыць навучэнцу універсітэта. Пры гэтым выкладчык вызваляецца ад перагрузкі, якая традыцыйна ўзнікае пры ўліку бясконцых "уважлівых прычын" ці выкарыстанні сістэмы адпрацовак студэнтам прапушчаных заняткаў. Выкладчык універсітэта павінен сістэматычна пашыраць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уласны навуковы патэнцыял і навукаёмістасць свайго прадмета, а не служыць “хуткай дапамогай” для студэнта. Пазбегнуць падобнай дэфармацыі ўзаемаадносін студэнта і выкладчыка часткова дапамагае рэйтынгавая сістэма.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ